ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 45 (5000) 16 лістапада 2018 г.

ISSN 0024-4686

Проза «філалагічная»? стар. 6

Янішчыц. Вянок памяці стар. 10—11

Уся праўда «Лістапада» стар. 14

16+

# ВЯЛІКАЯ ВАЙНА. ВОДГУЛЛЕ

Гэтымі днямі праз разнастайныя выстаўкі, кароткаметражныя фільмы і інтэрактыўныя праекты ў нашай краіне згадваюць стагоддзе завяршэння Першай сусветнай вайны.

Сапраўды, пасля заканчэння Першай сусветнай свет стаў іншы: тут гаворка і пра паламаныя лёсы юнакоў, якія так і не знайшлі месца ў новым жыцці, і пра страчанае пакаленне літаратараў. Фіцджэральд, Лоўрэнс, Олдынгтан, Хэмінгуэй… Да гэтага пераліку варта дадаць і нашых Максіма Гарэцкага, Алеся Гаруна, Кузьму Чорнага, Цішку Гартнага… Пра тую вайну раскажуць і шматлікія помнікі ды могілкі на Смаргоншчыне, муры Крэўскага замка, якія і праз стагоддзі пасля ўзвядзення абаранялі край ад ворагаў.

Працяг на стар. 2 ►




Фота Кастуся Дробава.



*Гучыць парадаксальна, але падчас Першай сусветнай у лёсе нашай краіны і беларускай мовы адбыліся значныя змены. Беларусь паўставала як маладая краіна, развівалася кнігавыданне на беларускай мове, а менш чым праз два месяцы пасля завяршэння Вялікай вайны нашу краіну па радыё абвесцяць вольнай рэспублікай.*

*На фота: беларускія кнігі пра падзеі Першай сусветнай і ваенная палявая бібліятэка.*

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 18045

# Вялікая вайна. Водгулле




Цяпер у Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі працуе выстаўка «Беларусь у Вялікай вайне 1914—1918 гг.». У Нацыянальным гістарычным музеі гісторыкі разам з калекцыянерам Уладзімірам Ліхадзедавым у экспазіцыі «1918. Нараджэнне новага свету», а таксама праз аўтарскі фотаальбом «Беларусь 1914—1918» паказалі падзеі Першай Сусветнай у кантэксце лёсу Еўропы. І кампанія *Wargaming* не засталася ўбаку: знакаміты распрацоўшчык камп'ютарных гульняў прадставіў кароткаметражны фільм «Атака мерцвякоў. Асавец» і мультымедыйныя версіі бронетэхнікі часоў Першай сусветнай.

*На фота: Баранавічы ў гады Першай сусветнай вайны. Фота з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава.*

---

**Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.**